ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі ўніверсітэт

ВЫДАЕЦЦА З 1935 г.

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 18 (1244) ● 24 мая 1979 г. Цана 2 кап.

## Вачыма сяброў

Выстаўка фотаздымкаў, прысвечаная 30-годдзю ГДР, размясцілася на трэцім паверсе галоўнага корпуса. Нямецкія студэнты Х. Кюн, Х. Мюлер, Л. Краузе, У. Цвайнерт і іншыя знаёмяць савецкіх сяброў са сваёй краінай. Вабіць спалучэнне старажытнай готыкі з сучаснай архітэктурай вядомых гарадоў ГДР. Аўтары здымкаў вядуць гледача па вуліцах Берліна і Галле, Вісмара і Ростака. Асобная падборка здымкаў расказвае пра старажытны палац Цвінгер, які размясціўся ў Дрэздэне.

Спыняюць увагу таксама фотаздымкі аб прыродзе, спорце, дзецях брацкай краіны.

## Конкурс «баявых лісткоў»

На механіка-матэматычным факультэце да Дня друку былі падведзены вынікі конкурсу на лепшы «баявы лісток». Журы назвала пераможцамі ІІІ паток І курса і ІІІ паток ІІ курса. Падзякі атрымалі лепшыя рэдактары А. Тарасевіч і М. Тарасевіч, студэнты 12-й групы І курса; Т. Быстрык з 3-й групы ІІ курса.

Названы таксама і нецікавыя, безыніцыятыўныя рэдкалегіі І патока ІІ курса, ІІ патока ІІ курса, ІІ патока ІІІ курса і ІІ патока IV курса.

## Хутка лета

У перыяд летніх канікулаў для замежных студэнтаў, якія вучацца ў нашым універсітэце, будуць арганізаваны экскурсіі ў Маскву, Іркуцк, Ерэван, 2 экскурсіі — у Ленінград.

Акрамя таго, у ліпені аўтапаязды «Дружба» пройдуць па дарогах Узбекскай ССР, Азербайджанскай ССР, Украінскай ССР.

Жадаючыя змогуць таксама набыць дом адпачынку «Нарач», пансіянат «Адлер» у Сочы.

## Чацвёрты традыцыйны

На радзіме Янкі Купалы, у Вязынцы, у чацвёрты раз сабраліся студэнты і выкладчыкі філалагічнага факультэта нашага універсітэта на свой традыцыйны злёт, які на гэты раз быў прысвечан надыходзячаму стагоддзю народных паэтаў Беларусі Я. Купалы і Я. Коласа.

Сярод гасцей злёту — беларускі паэт Рыгор Барадулін, пляменніца Янкі Купалы Ядвіга Юліянаўна Раманоўская, піянеры падшэфнай Вязынскай школы, заслужаны дзеяч навукі БССР прафесар Гомельскага універсітэта Мікалай Міхайлавіч Грынчык, ветэран Вялікай Айчыннай вайны, дацэнт філфака Вера Анісімаўна Захарава, другі сакратар Маладзечанскага райкома партыі Вячаслаў Антонавіч Ляшкевіч.

У праграме злёту — працоўны дэсант, турысцкая эстафета «Сцежкамі Купалы», конкурс выканаўцаў народных песень, літаратурная віктарына па творах Я. Купалы і Я. Коласа, паэтычны фестываль удзельнікаў універсітэцкага літаратурнага аб'яднання «Узлёт», экскурсія ў філіял музея Я. Купалы.

Свята ў Вязынцы закончылася прыняццем звароту да ўсіх студэнтаў-філолагаў у сувязі з падрыхтоўкай да 100-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы і Якуба Коласа.

(Наш кар.).

## Падведзены вынікі

Закончыліся спаборніцтвы першага этапа спартакіяды замежных студэнтаў і навучэнцаў ВНУ і тэхнікумаў г. Мінска.

**Баскетбол.**

І месца занялі прадстаўнікі БПІ, на ІІ—БДУ, на ІІІ—навучэнцы архітэктурна-будаўнічага тэхнікума, на IV — падінстытут, на V — педагагічны тэхнікум, на VI і VII адпаведна — машынабудаўнічы тэхнікум і тэхнікум сувязі.

**Стральба.**

Спартсмены БПІ, тэхнікума сувязі і ТВ-31 занялі першыя тры месцы. Прадстаўнікі нашага універсітэта былі сёмымі.

**Настольны тэніс.**

На І месцы, як і ў папярэдніх відах спорту, — БПІ, на ІІ—ТВ-31, на ІІІ — БДУ. Астатнія месцы адпаведна занялі медыцынскі інстытут, педагагічны інстытут, архітэктурна-будаўнічы тэхнікум, інстытут механізацыі сельскай гаспадаркі, тэхнікум сувязі, машынабудаўнічы тэхнікум.

Хутка будуць праведзены спаборніцтвы па футболу і лёгкай атлетыцы.

**А. ЯФІМАЎ,**
**старшы выкладчык кафедры фізвыхавання.**

## У праграме круглагадовай

17 мая на стадыёне БДУ урачыста адкрыліся спаборніцтвы па лёгкай атлетыцы ў праграме круглагадавой спартакіяды універсітэта.

Пад гукі Гімна БССР сцяг спаборніцтваў узняў прадстаўнік каманды фізікаў — пераможцаў мінулагодняга лёгкаатлетычнага першынства.

Спаборніцтвы пачаліся стартам жаночага забегу на 100 м. Адначасова ў сектары па штурханню ядра пачалі мерацца сіламі мужчыны.

У першы дзень спаборніцтваў лепшымі былі гісторыкі. Магчыма таму, што іх натхняў намеснік дэкана гістфака А. Г. Кляцкоў, на жаль, адзіны прадстаўнік дэканатаў нашых факультэтаў.

(Наш кар.).

## Сустрэча з гераічным мінулым

Нядаўна ў музеі Чырванасцяжнай Беларускай ваеннай акругі адбыўся «Урок мужнасці», у якім прынялі ўдзел студэнты ІІ курса гістарычнага факультэта. Ён быў прысвечан 35-й гадавіне з дня вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў.

Студэнты пазнаёміліся з экспанатамі музея, потым адбылася сустрэча з ветэранамі вайны. Гасцямі рабят былі генерал-маёр В. І. Шамадзі і генерал-палкоўнік Г. І. Арына.

Генерал-маёр В. І. Шамадзі падзяліўся сваімі успамінамі аб першых, самых цяжкіх днях вайны, расказаў аб мужнасці і гераізме савецкіх людзей.

Генерал-палкоўнік Г. І. Арына, які прымаў удзел у распрацоўцы і правядзенні аперацыі «Баграціён», падрабязна расказаў удзельнікам сустрэчы аб падрыхтоўцы гэтай аперацыі, адзначыў важную ролю партызан у яе правядзенні, а таксама спыніўся на эпізодах заключнага этапа Вялікай Айчыннай вайны.

«Урок мужнасці» выклікаў вялікую цікавасць студэнтаў.

**М. РУСАКОВІЧ.**

## Канцэрт гасцей

У актавай зале універсітэта адбыўся канцэрт ансамбля песні і танца Вільнюскага дзяржаўнага універсітэта. Сустрэча ансамбля са студэнтамі нашага універсітэта праходзіла ў рамках дагавора, заключанага паміж БДУ і Вільнюскім універсітэтам. У праграме канцэрта гучалі народныя літоўскія песні, удзельнікі ансамбля паказалі танцы літоўскага народа. Цёплымі апладысментамі прынялі гасцей нашы студэнты.

(Прэс-цэнтр прафкома БДУ).

# ЗВАРОТ

## УДЗЕЛЬНІКАЎ ЗЛЁТУ СТУДЭНТАЎ-ВЫДАТНІКАЎ БДУ ІМЯ У. І. ЛЕНІНА ДА ЎСІХ СТУДЭНТАЎ УНІВЕРСІТЭТА

Дарагія сябры! Студэнцтва нашай краіны разам з усім савецкім народам уносіць вялікі ўклад у выкананне велічных планаў, вызначаных XXV з'ездам КПСС, лістападаўскім (1978 г.) Пленумам ЦК КПСС і XVIII з'ездам ВЛКСМ.

Мы, студэнты старэйшай ВНУ рэспублікі, якая носіць імя вялікага Леніна, сёння з гонарам адзначаем, што ў нашых радах 1398 выдатнікаў, 4221 студэнт, якія займаюцца на добра і выдатна. 18 іменных стыпендыятаў, 407 студэнтаў па выніках дзвюх экзаменацыйных сесій узнагароджаны значком ЦК ВЛКСМ і Мінвуза СССР «За выдатную вучобу».

Наш гонар — студэнты, якія сумяшчаюць выдатную вучобу з актыўнай грамадскай работай.

2100 студэнтаў універсітэта прынялі ўдзел у трэцім працоўным семестры-78.

Практыка камуністычнага будаўніцтва ставіць усё новыя патрабаванні перад савецкімі студэнтамі па паляпшэнню якасці ведаў, павышэнню паспяховасці, выпрацоўцы камуністычнай перакананасці, актыўнай жыццёвай пазіцыі.

Злёт студэнтаў-выдатнікаў БДУ імя У. І. Леніна лічыць жыццёва важным, каб кожны студэнт выпрацаваў у сабе камуністычную перакананасць, актыўную жыццёвую пазіцыю, гатоўнасць, волю і ўменне будаваць камунізм, павышаў узаемную патрабавальнасць і адказнасць за справы факультэта і універсітэта.

Наша задача—дабівацца, каб лозунг «Ніводнага адстаючага побач!» стаў сапраўды кроўнай справай кожнага студэнта.

Мы заклікаем усіх студэнтаў універсітэта выдатнай вучобай, ударнай працай на аб'ектах трэцяга працоўнага семестра, актыўным удзелам у навукова-даследчай і грамадскай рабоце адказаць на клопаты партыі і народа, памнажыць свой удзел у выкананні рашэнняў XXV з'езда КПСС і XVIII з'езда ВЛКСМ. З гонарам выконваць вялікія запаветы Ільіча.



Напружана рыхтуюцца да сесіі студэнты фізічнага факультэта. Чацвёртакурснік Алег Сцефановіч у лабараторыі фізікі цвёрдага цела праглядае навуковую літаратуру.

Фота У. Крыловіча.

## ДА 180-годдзя З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ А. С. ПУШКІНА

У інтэрнаце № 4 нашага універсітэта прайшоў літаратурны вечар, прысвечаны знамянальнай падзеі — 180-годдзю з дня нараджэння Аляксандра Сяргеевіча Пушкіна. Вечар адкрыў уступным словам выкладчык кафедры рускай класічнай літаратуры Л. А. Ванковіч. Ён коратка расказаў прысутным аб значэнні і месцы вялікага рускага паэта ў сусветнай літаратуры, аб тым уплыве, які робяць творы Пушкіна на сучаснага чытача.

Агляд дарэвалюцыйных выданняў твораў А. С. Пушкіна зрабіла загадчыца аддзела рэдкіх і каштоўных кніг бібліятэкі універсітэта А. А. Сянкевіч.

На вечары была арганізавана кніжная выстаўка, прысвечаная жыццю і творчасці вялікага паэта. На ёй былі шырока прадстаўлены выданні твораў Пушкіна, а таксама манаграфіі, у якіх даследуецца творчасць паэта.

Студэнты філалагічнага факультэта прачыталі вершы і урыўкі з празаічных твораў А. С. Пушкіна. У заключэнне вечара адбылася віктарына, былі ўручаны прызы.

Вечар быў арганізаван філалагічным факультэтам і аддзелам рэдкіх і каштоўных кніг бібліятэкі універсітэта.

**Л. АНДРЭЕВА.**



20 мая ў раёне філіяла БДУ (Шчамысліца) быў падняг сцяг III злёту СБА — пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва будаўнічых атрадаў у падрыхтоўчым перыядзе. Мэта злёту: падвядзенне вынікаў спаборніцтва за званне «Лепшы студэнцкі будаўнічы атрад Белдзяржуніверсітэта ў падрыхтоўчым перыядзе»; прапаганда студэнцкага будаўнічага руху; падрыхтоўка да эфектыўнай дзейнасці ў працоўны перыяд.

Удзельнікі злёту — лепшыя атрады факультэтаў, такія, як СБА імя Аляксандра Матросава (факультэт радыёфізікі і электронікі); СБА імя акадэміка Каралёва (фізфак); СБА імя Ленінскага камсамола—лепшы зводны атрад універсітэта; камандзіры і камісары ўсіх лінейных СБА.

Поспех працоўнага семестра ў многім залежыць ад якаснай работы камсамольскіх арганізацый факультэтаў па фарміраванню СБА. «На студэнцкую будоўлю — без адзінай тройкі!» — вось мэта, да якой імкнецца камітэт камсамола універсітэта пры падрыхтоўцы да працоўнага лета-79.

На пасяджэнні камсамольскага актыву ў пачатку злёту з дакладам аб гатоўнасці зводнага атрада універсітэта да выканання вытворчай і грамадска-палітычнай праграмы ў трэцім семестры выступіў сакратар камітэта камсамола БДУ П. Брыгадзін. У праграму злёту ўваходзілі: афармленне лагера, урачыстьы мітынг, спартыўная праграма, працоўны дэсант, агляд насценнага друку, конкурс агітбрыгад.

**САЮЗ КАМУНІСТЫЧНАЙ МОЛАДЗІ ПАВІНЕН БЫЦЬ УДАРНАЙ ГРУПАЙ, ЯКАЯ ВА ЎСЯКАЙ РАБОЦЕ АКАЗВАЕ СВАЮ ДАПАМОГУ, ПРАЯЎЛЯЕ СВАЮ ІНІЦЫЯТЫВУ, СВОЙ ПАЧЫН.**

**У. І. ЛЕНІН.**

# ПРАЦОЎНЫ СЕМЕСТР—НА ВЫДАТНА

**(З даклада сакратара камітэта камсамола БДУ П. І. Брыгадзіна на трэцім злёце СБА — пераможцаў сацыялістычнага спаборніцтва будаўнічых атрадаў у падрыхтоўчым перыядзе.)**

Усе мы знаходзімся пад уражаннем знамянальнай падзеі ў жыцці студэнцтва — Усесаюзнага злёту студэнцкіх будаўнічых атрадаў, звароту Генеральнага сакратара ЦК КПСС, Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР таварыша Л. І. Брэжнева да ўдзельнікаў злёту студэнцкіх атрадаў.

«Працуючы ў атрадах, — адзначаў Л. І. Брэжнеў,—у адзіным страі з рабочымі і калгаснікамі, студэнты і навучэнцы атрымліваюць вопыт калектыўнай працы і творчасці, замацоўваюць на практыцы атрыманыя веды, выхоўваюць у сабе актыўную жыццёвую пазіцыю. Штогод абнаўляецца састаў атрадаў, але нязменнымі застаюцца традыцыі самаадданай працы, дух рамантыкі і бескарыслівасці, дружбы і сяброўства». Гэта высокая ацэнка ролі СБА абавязвае нас якасна, з высокай эфектыўнасцю правесці трэці працоўны семестр 1979 года.

Першая і асноўная задача камітэтаў камсамола факультэтаў, камітэта камсамола універсітэта ў падрыхтоўчым перыядзе—падбор кіраўнікоў студэнцкіх атрадаў.

Большасць камітэтаў камсамола, ШПС факультэтаў якасна і ў тэрмін правялі падбор і зацвярджэнне камандзіраў і камісараў лінейных СБА. Хочацца адзначыць добрую працу ў гэтым напрамку камітэтаў камсамола, ШПС механіка-матэматычнага факультэта, факультэта радыёфізікі і электронікі. У той жа час на фізічным, факультэце прыкладной матэматыкі, хімічным кіраўнікі некаторых атрадаў былі вызначаны толькі ў канцы красавіка. А на факультэце прыкладной матэматыкі пытанне аб кіраўніках СБА «Брыганціна» і «Атланты» заставалася адкрытым да 18 мая. На юрыдычным факультэце на працягу ўсяго падрыхтоўчага перыяду адбываліся перастаноўкі кіраўнікоў. Такое становішча спраў на ўказаных факультэтах, вядома, уплывае на якасць фарміравання гэтых студэнцкіх атрадаў.

Важнейшым напрамкам у рабоце ШПС у падрыхтоўчы перыяд з'яўляецца правядзенне дагаворнай кампаніі СБА. У адпаведнасці з пастановай пленума камітэта камсамола дагаворную кампанію у г. Мінску і Мінскай вобласці неабходна было завяршыць да 7 снежня 1978 года. Але яшчэ і сёння даводзіцца канстатаваць, што ні адзін камітэт камсамола не выканаў гэта рашэнне.

Асноўным мерапрыемствам падрыхтоўчага перыяду з'яўляецца камплектаванне СБА. У гэтым навучальным годзе ў Белдзяржуніверсітэце сфарміравана 88 атрадаў, у якіх налічваецца 2637 чалавек.

Сёння неабходна адзначыць больш высокі ўзровень работы камсамольскіх арганізацый большасці факультэтаў па фарміраванню СБА. Нас задавальняе дзелавое супрацоўніцтва камітэта камсамола факультэта радыёфізікі і электронікі з партыйным бюро, дэканатам. І партыйнае бюро і дэканат аказваюць пастаянную дапамогу і падтрымку камсамольскай арганізацыі. Не выпадкова таму на факультэце нарадзілася ініцыятыва «Кожны студэнт факультэта—баец СБА». Сёння ўпэўнена можна гаварыць аб тым, што зводны факультэцкі атрад аб'ядное ўвесь студэнцкі калектыў.

У той жа час бюро камітэта камсамола універсітэта прад'яўляе сур'ёзныя прэтэнзіі да дзейнасці камітэтаў камсамола, ШПС хімічнага і факультэта прыкладной матэматыкі. Фарміраванне СБА тут было пушчана на самацёк. У выніку камсамольскім арганізацыям гэтых факульуэтаў прыходзіцца займацца камплектаваннем атрадаў яшчэ і зараз.

Асобна трэба сёння сказаць аб падрыхтоўцы атрадаў для працы на будоўлях г. Мінска. Звычайна на ўсіх факультэтах у гэтыя атрады накіроўваліся студэнты першых курсаў. Напярэдадні Алімпійскіх гульняў перад будаўнічымі арганізацыямі горада стаяць вялікія і складаныя задачы. Павысіліся патрабаванні і да фарміравання гарадскіх атрадаў. Камітэт камсамола БДУ лічыць, што на будаўніцтве гарадскіх аб'ектаў павінны працаваць самыя вопытныя і найбольш падрыхтаваныя байцы СБА. Гэта наш абавязак.

З кожным годам усё больш рознабаковай становіцца сфера дзейнасці студэнцкіх атрадаў. Акрамя будаўнічых і сельскагаспадарчых атрадаў, БДУ імя У. І. Леніна фарміруе атрад праваднікоў і атрад, які будзе працаваць на абутковай фабрыцы «Прамень». Практыка фарміравання такіх атрадаў з кожным годам будзе заахвочвацца.

У апошнія гады ўсё часцей і часцей паяўляюцца довады аб выкарыстанні на будаўнічых аб'ектах супрацоўнікаў і выкладчыкаў. Наш універсітэт выступіў з ініцыятывай аб стварэнні будаўнічых атрадаў супрацоўнікаў. І ўпершыню ў БДУ імя У. і. Леніна ў 1979 годзе на базе фізічнага факультэта і ФПМ сфарміраваны два атрады супрацоўнікаў.

БДУ — інтэрнацыянальная ВНУ. У нашым універсітэце займаецца больш як 600 студэнтаў з 60 краін свету. Прапаганда сацыялістычнага ладу жыцця сярод замежных студэнтаў — адна з асноўных задач камсамола. Вялікую ролю ў гэтай рабоце адыгрываюць студэнцкія будаўнічыя атрады. Ва універсітэце сфарміравана 11 інтэратрадаў, у якіх будуць працаваць 76 замежных студэнтаў.

Адным з важнейшых крытэрыяў ацэнкі дзейнасці СБА ў працоўны перыяд з'яўляецца грамадска-палітычная работа. Якасна падрыхтаваць атрад да выканання гэтай праграмы—адна з галоўных задач камсамольскіх арганізацый факультэтаў, ШПС універсітэта.

У нас ужо склалася вызначаная сістэма падрыхтоўкі СБА да грамадска-палітычнай дзейнасці. У гэтым годзе падрыхтавана 359 атрадных лектараў. За падрыхтоўчы перыяд імі прачытана 1451 лекцыя.

Палепшылася якасць афармлення нагляднай агітацыі, праведзен агляд атраднага насценнага друку, у якім першае месца заняў гістарычны факультэт.

У кожным атрадзе створаны агітбрыгады. У падрыхтоўчы перыяд імі дадзена 128 канцэртаў мастацкай самадзейнасці.

Па выніках прайшоўшага ў красавіку агляду-конкурсу студэнцкіх агітбрыгад I—II месцы раздзялілі зводны інтэрнацыянальны СБА «Сябры» і СБА імя Пічэты (гістфак), III месца заняў СБА «Мара» (філфак).

Але гэта лепшыя агітбрыгады. Такое становішча спраў, на жаль, не на ўсіх факультэтах. Таму ШПС неабходна звярнуць самую сур'ёзную ўвагу на рэпертуар брыгад, ідэйны і прафесіянальны ўзровень выканаўчага майстэрства самадзейных артыстаў.

Вялікае месца ў падрыхтоўчы перыяд займае падрыхтоўка да вядзення ваенна-патрыятычнай і шэфскай работы. Ва ўсе СБА універсітэта залічаны ганаровымі байцамі героі вайны і працы, героі-камсамольцы, вядомыя вучоныя і г. д. Грошы, зробленыя на імя ганаровага байца, пералічваюцца ў Фонд міру.

Асобай падзякі заслугоўвае ініцыятыва байцоў СБА юрыдычнага і гістарычнага факультэтаў, якія залічваюць ганаровымі байцамі былых выкладчыкаў і студэнтаў універсітэта, загінуўшых на франтах Вялікай Айчыннай вайны, а таксама ветэранаў працы. СБА універсітэта працягваюць работу па правядзенню аперацыі «Памяць».

Ужо становіцца ў нас добрай традыцыяй стварэнне камуністычнага атрада. У гэтым годзе сфарміраван такі атрад. Ён будзе працаваць на будаўніцтве помніка дзецям, загінуўшым у гады Вялікай Айчыннай вайны. Узначаліць атрад сакратар камітэта камсамола мехмата Аляксандр Казулін.

Па выніках падрыхтоўчага перыяду месцы ў сацыялістычным спаборніцтве размеркаваліся наступным чынам:

I месца—мехмат;

II месца—факультэт радыёфізікі і электронікі;

III месца — фізфак;

IV месца — гістфак;

V месца — юрыдычны факультэт;

VI месца — філалагічны факультэт;

VII месца — падрыхтоўчае аддзяленне;

VIII — IX месцы — ФПМ, хімфак.

У сацыялістычным спаборніцтве паміж лінейнымі СБА факультэтаў месцы размеркаваліся наступным чынам:

I месца—СБА імя Нікольскага (гістфак);

II месца—СБА «Універсітэцкі» (гістфак);

III месца—СБА «Баграціён» (факультэт радыёфізікі).

Лепшым сярод зводных атрадаў універсітэта стаў СБА імя Ленінскага камсамола. Мы упэўнены, што ўсе атрады універсітэта ліквідуюць недахопы і ўпушчэнні, прадэманструюць высокую арганізаванасць, дакладную работу, актыўную грамадска-палітычную дзейнасць.

Мы заклікаем камандзіраў і камісараў лінейных атрадаў, усіх байцоў СБА заўсёды памятаць аб тых высокіх пазіцыях, якія былі заваяваны ў працоўным семестры 1978 года.



**«...Шагают ребята, шагают девчата**
**Своими руками историю делать».**

Фота В. Маскалёва.



Да сесіі засталіся лічаныя дні.

Фота С. Лыскаўца.

# Сустрэча з мастацтвам

Да канцэрта заставалася яшчэ паўгадзіны, а ў актавай зале філалагічнага факультэта ўжо раздаваліся песні. Гэта рыхтуецца да выступлення акадэмічны жаночы хор Тартускага універсітэта. Удзельнікі хору—студэнты медыцынскага, філалагічнага, геаграфічнага факультэтаў універсітэта. Яны прыехалі ў Мінск па ўласнай ініцыятыве, каб пазнаёміцца з нашым універсітэтам, з горадам, а таксама выступіць з канцэртам.

Пачаўся канцэрт. Ён складаўся з дзвюх частак. У першай гучалі класічныя творы Моцарта, Вердзі і іншых кампазітараў. Яны займаюць асноўнае месца ў рэпертуары хору. І трэба адзначыць, гучалі яны сапраўды па-майстэрску. Удала падабраныя галасы, правільна расстаўленыя партыі — усё гэта садзейнічала паспяховаму выступленню нашых гасцей.

Не менш цікавай была і другая частка выступлення, у якой гучалі нацыянальныя песні Эстоніі. Дзяўчаты ўсебакова перадалі нацыянальны каларыт сваіх песень. Лірычнасць, задушэўнасць і шчырасць выканання вельмі спадабаліся слухачам.

Найбольшае ўражанне на слухачоў зрабілі песні «Накцюрн» Моцарта, «Калыбельная» і іншыя, пасля выканання якіх доўга не сціхалі апладысменты.

Вось ужо 16 год кіруе гэтым творчым калектывам Вайке Уйбапуу. Пад яе кіраўніцтвам хор стаў лаўрэатам І Усесаюзнага фестывалю самадзейнай творчасці. Ён з'яўляецца таксама лаўрэатам мастацкай прэміі ЛКСМ Эстоніі за 1978 год.

Заснаван акадэмічны жаночы хор быў у 1945 годзе Рыхардам Рытсінгам, вядомым эстонскім кампазітарам. За гэты час хор пабываў у творчых паездках у ГДР, Венгрыі, у многіх гарадах Савецкага Саюза.

Зараз у калектыве вельмі напружаны час. У наступным годзе ён адзначыць свой юбілей — 35-годдзе з дня заснавання, а таксама выступіць на ІІ Усесаюзным фестывалі самадзейнай творчасці.

Выступленне хору закончылася студэнцкай песняй «Гаудэамус». Разам з хорам гэту песню спявалі ўсе прысутныя.

Пасля канцэрта доўга не разыходзіліся. Размаўлялі з тартускімі студэнтамі аб студэнцкім жыцці, дзяліліся ўражаннямі ад канцэрта.

Алесь ВАСІЛЬКЕВІЧ.
(Прэс-цэнтр прафкома).

# ТАК ТРЫМАЦЬ!

Слаўны шлях у сваім развіцці прайшоў студэнцкі будаўнічы рух. У 1958 годзе першы студэнцкі атрад у нашай краіне выехаў на працу ў Булаеўскі раён Казахстана. З таго часу прайшло больш як 20 гадоў. Значна вырасла колькасць удзельнікаў гэтага пачыну. Так, напрыклад, калі першы будаўнічы атрад налічваў у сваім саставе нямногім больш як 300 чалавек, то зараз студэнцкі будаўнічы рух ахапіў больш чым 600-тысячную армію студэнцтва.

У гэтым годзе нашаму студэнцкаму будаўнічаму атраду «Кастрычнік» імя Дзяржынскага прадстаіць працаваць на землях Казахстана. Ужо зараз атрад разгарнуў вялікую работу па плану падрыхтоўчага перыяду. За прайшоўшы перыяд у сацыялістычным спаборніцтве сярод атрадаў гістарычнага факультэта ён дабіўся значных поспехаў. З кожным днём работа атрада становіцца ўсё больш арганізаванай, і гэта, на мой погляд, заслуга камандзіра атрада Сяргея Салаўёва і камісара Андрэя Свірко, якія змаглі так арганізаваць работу, што кожны член атрада мае сваё даручэнне і на сходах атрада кожны яго член дакладвае аб выкананні задання. Такая пастаноўка справы садзейнічае своечасоваму і дакладнаму выкананню ўсіх сацыялістычных абавязацельстваў атрада. Ужо зараз яго байцамі прачытан шэраг лекцый, выпушчаны дзве газеты, дадзены канцэрты, сабрана бібліятэка для падшэфнай школы, пачалося афармленне альбома аб Дзяржынскім, праведзены суботнік, прысвечаны Дню касманаўтыкі, і шэраг іншых мерапрыемстваў.

М. МІКОЛІЧ.

## КУРАТАР — ГРУПА

# АДКУЛЬ ПОСПЕХ...

— Ды што тут казаць, на маю думку, прычына ўважлівая, — сказаў Алёша Данільчанка. — Саша не мог прапусціць заняткі проста так. Тут падвялі сямейныя абставіны. Трэба ўлічыць гэта.

У аўдыторыі зашумелі. І сапраўды, новае месца жыхарства, пераезд — справы жыццёвыя. Таму і паявілася ў журнале наведвання некалькі гадзін пропуску. Цяпер у Сашы ўсё добра. Старанна вучыцца, наведвае заняткі.

— А як справа з вучобай увогуле? — пацікавіўся Сяргей Аляксандравіч Сахацкі — куратар групы.

І зноў палілася шчырая, дзелавая размова. Ужо больш гадзіны студэнты спрачаліся, даказвалі, прапаноўвалі.

— І так кожны раз,—расказвае Сяргей Аляксандравіч, — калі збіраемся на куратарскай гадзіне. Усе пытанні студэнты вырашаюць калектыўна. Караюць віноўніка, узнагароджваюць актывістаў. Мне даводзіцца ўмешвацца толькі ў самыя крытычныя бакі жыцця, падказаць, параіць.

Група палітэканомаў ІІІ курса гістарычнага факультэта — пераможца сацыялістычнага спаборніцтва сярод груп гуманітарных факультэтаў. Па выніках зімовай сесіі яна заняла другое месца.

Група не першы год выходзіць пераможцай. Два папярэднія гады трымала лідэрства.

У гэтым годзе група таксама пераможца спаборніцтва. Яе ўзнагародзілі, абяцалі выдзеліць сродкі на арганізацыю экскурсіі. Але, як кажуць, абяцанага тры гады чакаюць. Студэнты звярталіся ў розныя інстанцыі. Відаць, прафсаюзная арганізацыя універсітэта не можа знайсці сродкі або наогул упусціла з поля зроку гэтае мерапрыемства. Але ўсё ж студэнты чакаюць і спадзяюцца.

...Група. Актыў. Куратар. У паўсядзённым студэнцкім жыцці мы часта чуем гэтыя словы. Чуем пра добрую або дрэнную групу, камсамольскі або прафсаюзны актыў, строгіх або звычайных куратараў. Што тут галоўнае? Хто больш робіць для таго, каб групу назвалі лепшай, і не толькі на факультэце, але і ва універсітэце? Аб гэтым я спытала ў Сяргея Аляксандравіча.

— На маю думку, поспех перш за ўсё залежыць ад саміх студэнтаў, ад іх зацікаўленасці ў вучобе, грамадскай рабоце. Бо нават самы ідэальны куратар не зможа зрабіць сваю групу ўзорнай, калі няма ў гэтым агульнай зацікаўленасці.

А калі гаварыць аб маёй групе, дык я ёю вельмі задаволен. Мне, шчыра кажучы, проста пашанцавала. Кожны студэнт добра разумее ўсю адказнасць перад сабой і таварышамі. І гэта, магчыма, таму, што большая частка студэнтаў — члены партыі, людзі дарослыя, самастойныя. Іменна за гэтай «партыйнай ячэйкай» і цягнуцца ўсе астатнія.

Сяргей Аляксандравіч Сахацкі працуе з групай з 1-га курса. Спачатку было нялёгка.

Быў такі выпадак. Сяргей (я наўмысна не называю яго прозвішча) на выдатна здаў сесію. Але застаўся за ім доўг па фізічнаму выхаванню. Стыпендыю яму, вядома, не далі. Сяргей ніяк не мог пагадзіцца з гэтым. Маўляў, як гэта так, выдатнік—без стыпендыі. Тут ён і замахаў рукамі, забегаў:

— Калі я сялянскі сын, дык мной можна кідацца, крыўдзіць. Мне і стыпендыю можна не даць, усё роўна не хопіць смеласці выпрошваць.

Пэўна, і застаўся б хлопец пры сваіх думках, каб не Сяргей Аляксандравіч. Не аднойчы даводзілася яму размаўляць з Сяргеем, тлумачыць памылковасць яго поглядаў. Відаць, разумная, дзелавая, патрэбная размова выхавацеля адыгрывае вялікую ролю. Яна дапамагла і Сярожу. Зараз гэты выпадак ён успамінае з усмешкай. І такія сяброўскія гутаркі былі ў Сяргея Аляксандравіча з многімі студэнтамі. Галоўнае, не даць выявіцца ярка той мяжы, якая звычайна існуе паміж выкладчыкам і студэнтам, а наадварот, у такіх размовах увогуле сцерці яе.

Сёння ўсе праблемы студэнцкага жыцця вырашае сама група. Самі прапануюць, самі выконваюць, самі аналізуюць.

У групе яшчэ ні разу не было сур'ёзных промахаў у вучобе, дысцыпліне, бо тут няма пасіўных. Справа кожнага — гэта справа ўсіх.

— Наша вучоба,—расказвае староста групы Пётр Лямешчанка,—гэта не толькі назапашванне пэўных ведаў, але і творчае іх выкарыстанне, сур'ёзны падыход да любой справы.

Л. ЖЫЛІНСКАЯ.



За патрэбнай даведкай — у бібліятэку. Фота М. Дубовіка.

# ПАДАРОЖЖА Ў ГІСТОРЫЮ

— Гістарычны музей на нашым факультэце дзейнічае ўжо больш года. Да нас у госці прыходзяць не толькі студэнты іншых факультэтаў, але і школьнікі, навучэнцы падрыхтоўчага аддзялення, замежныя студэнты, — расказвае старшы лабарант музея Наталля Андрэеўна Дабржэўская, знаёмячы з гістарычным мінулым старэйшай ВНУ. — Матэрыялы збіралі самі студэнты і выкладчыкі факультэта пад кіраўніцтвам Аляксандра Аляксандравіча Стуканава, Мікалая Міронавіча Ціханаўца, Алега Андрэевіча Яноўскага. Музей быў адкрыт у дзень 50-годдзя універсітэта.

...Дзве невялікія залы. Экспанаты, дакументы, фотаздымкі... Вось здымак спецыяльнай камісіі ў Маскве пры Наркамасветы, якая павінна была распрацаваць вучэбныя планы факультэтаў, падабраць прафесараў і дапамагчы арганізаваць вучэбна-дапаможныя ўстановы універсітэта.

— Гэта была важная і адказная работа, — працягвае Наталля Андрэеўна, — але яе прыйшлося неўзабаве спыніць, бо летам 1919 года Беларусь акупіравалі інтэрвенты. І толькі праз год, калі акупантаў прагналі, зноў прыступілі да распачатага.

У снежні 1920 года ў Мінск прыехалі члены маскоўскай камісіі, сярод якіх быў прафесар У. І. Пічэта, пазней першы рэктар Белдзяржуніверсітэта, і іншыя. Яны займаліся пытаннямі падрыхтоўкі памяшканняў, удакладнення вучэбных планаў, размеркавання факультэтаў, падбору выкладчыцкіх кадраў.

А пасля вырашэння ўсіх арганізацыйных пытанняў 18 красавіка 1921 года Прэзідыум ЦВК БССР прыняў пастанову: адкрыць універсітэт у саставе факультэтаў — рабочага, грамадскіх навук, медыцынскага, сельскагаспадарчага і фізікаматэматычнага. Ужо ў маі быў аб'яўлен прыём заяў ад жадаючых вучыцца ва універсітэце, а першага чэрвеня пачаліся заняткі на факультэце. Першымі пераступілі прыступку рабфака 160 чалавек: 69 рабочых, 72 з вёскі, 19 чырвонаармейцаў, камуністы і камсамольцы.

30 кастрычніка 1921 года адбылося ўрачыстае адкрыццё універсітэта. Газета «Звязда» пісала: «Сёння свята навукі ў Беларусі... Збылося спрадвечнае...».

Пазней адкрыўся факультэт грамадскіх навук, які рыхтаваў навукова-практычных работнікаў сацыялістычнага будаўніцтва. У яго ўваходзілі 4 аддзяленні: грамадска-педагагічнае, этнолагалінгвістычнае, эканамічнае, прававое. Дзейнічаюць студэнцкія арганізацыі. Жыццё абнаўляецца. Студэнты арганізуюць экскурсіі, навуковыя экспедыцыі, праводзяць археалагічныя раскопкі.

Ужо ў 30-х гадах на базе факультэтаў універсітэта было арганізавана некалькі самастойных інстытутаў: медыцынскі, інстытут народнай гаспадаркі, педагагічны.

Гады першых пяцігодак, самаадданая праца, вучоба. У заліко ўках сустракаеш толькі «выдатна».

Вайна... Студэнтам 41-га прыйшлося трымаць экзамен на франтах Вялікай Айчыннай, самы складаны і адказны ў жыцці. Свята Перамогі яны набліжалі, як маглі. А потым адбудоўвалі ўсё спачатку.

Цяпер універсітэт — буйнейшая навучальная ўстанова краіны. Кожны год ён рыхтуе прыкладна 2500 спецыялістаў рознага профілю. Тут працуе больш як 2000 выкладчыкаў.

...Маё знаёмства з музеем гісторыі БДУ закончылася. Не менш цікавым і захапляючым было падарожжа па залах археалогіі, этнаграфіі і нумізматыкі.

Л. САДЛУЦКІ,
студэнт гістфака.

# ШЛЯХ ДА ПОСПЕХУ

Ішла звычайная трэніроўка па барацьбе дзю-до і самба. Трэнер строгім голасам даваў указанні, папраўляў памылкі. Юнак, які стаяў каля дзвярэй, пераступаючы з адной нагі на другую, ніяк не адважваўся падысці бліжэй.

Было гэта два гады назад, калі толькі фарміравалася секцыя па гэтых папулярных відах барацьбы. Тым нясмелым юнаком быў студэнт механіка-матэматычнага факультэта Аляксандр Юркевіч. Ён адразу вызначыўся сярод іншых вынослівасцю, працавітасцю. Амаль два гады трэніровак, работа над сабой зрабілі яго масцітым барцом.

— На татамі, як і за вучэбным сталом, патрэбна думаць, знаходзіць выхады з самых безнадзейных становішчаў, — гаворыць Саша і дадае: — так што вучобе спорт — вялікая дапамога.

Сапраўдны барэц пазнаецца ў спаборніцтвах. Былі яны і ў Аляксандра Юркевіча. З кожным разам больш складаныя і цяжкія. Перамогі даваліся нялёгка. Успамінаецца першынство універсітэта па дзю-до. Саша верыў, што пераможа ў ім, але адной веры мала, патрэбны ўпартасць, настойлівасць, добрая фізічная загартоўка. Гэтымі якасцямі валодаў Аляксандр Юркевіч і, выйграўшы ўсе паядынкі, стаў чэмпіёнам. Пасля чэмпіяната падышоў да Сашы трэнер. Віншавання не было, быў толькі позірк, які бачыў Саша на твары Мікалая Аляксандравіча зрэдку, толькі ў самыя радасныя хвіліны. Ён быў задаволен Аляксандрам і коратка сказаў:

— Рыхтуйся да чэмпіяната БССР сярод студэнтаў па самба.

І вось чэмпіянат. Трэнер адразу папярэдзіў, што барацьба будзе напружанай.

Паядынак — вось дзе праяўляюцца майстэрства, воля да перамогі кожнага барца. Галоўнае — не спалохацца, не «згарэць» раней часу. Саша ўважліва слухаў парады Мікалая Аляксандравіча, адчуваў, як моцна верыць у яго сілы трэнер, і разумеў, што не апраўдаць гэтага даверу ён не мае права.

Свісток суддзі абвясціў аб пачатку паядынку. Адразу маленькая разведка, і вось, вось тое, чаго так хацеў, чакаў ад яго Мікалай Аляксандравіч: удалы прыём — і ёсць чатыры балы ў карысць Аляксандра. Паядынак ён выйграў.

Толькі два штрафныя ачкі не далі магчымасці Аляксандру Юркевічу падняцца на вышэйшую ступеньку п'едэстала. Ён стаў сярэбраным прызёрам чэмпіяната БССР сярод студэнтаў па барацьбе самба. Гэта вялікі поспех юнака.

**А. РУСАКОВІЧ,**



**На здымку:** Аляксандр **Юркевіч** (фота аўтара).

# спорт

# У ГОНАР ЮБІЛЕЮ

Май вельмі багаты на розныя лёгкаатлетычныя спаборніцтвы. Сведкі гэтага—афіцыйныя старты спартсменаў каманды БДУ імя У. І. Леніна ў першынстве горада сярод ВНУ, удзел некаторых студэнтаў універсітэта ў нядаўна прайшоўшых спаборніцтвах на Кубак СССР — кубак «Известий» па лёгкай атлетыцы мінскай зоны.

Добрыя вынікі паказалі ў бегу на 800 метраў В. Саварчэўскі (гістфак) —2.01 і А. Веруш (журфак) — 2.06. Студэнты А. Жыльскі (гістфак) і С. Бабровіч (хімфак) прынялі ўдзел у бегу на 5.000 м.

Не паспелі трэнеры каманды В. В. Зарэцкая і В. Я. Шпігаў падвесці вынікі выступленняў, як зноў іх выхаванцам прыйшлося выходзіць на бегавую дарожку. Каманда БДУ імя У. І. Леніна прыняла ўдзел разам са спартыўнымі калектывамі ВНУ Рыгі, Тарту, Адэсы, Кішынёва, Алма-Аты, Тбілісі, Кракава (ПНР) і Грэйфсвальда (ГДР) у міжнародных спаборніцтвах лёгкаатлетаў, прысвечаных 400-годдзю Вільнюскага дзяржаўнага універсітэта імя В. Капсукаса, якія праходзілі на цэнтральным рэспубліканскім стадыёне «Жальгірыс».

Далёка кінуў кап'ё Э. Матусявічус — 71,52 м, В. Валюнайтэ першынствавала ў бегу на 400 метраў сярод жанчын—57,1 сек. Добра пранеслі эстафетную палачку мужчыны і жанчыны Вільнюса.

З поспехам выступілі і студэнты БДУ. Лепшай была на самай кароткай спрынтарскай дыстанцыі І. Чурсіна (хімфак) — 12,2, другой — яе сяброўка па камандзе Т. Кніявец, якая прайграла Ірыне ўсяго адну дзесятую долю секунды. У сектары штурхання ядра не было роўных М. Войтавай — 17,78. Яна амаль на метр апярэдзіла сваю саперніцу Н. Восінаву (Тарту), заняўшую другое месца. Напружаная барацьба была паміж В. Луневым (БДУ) і Л. Балквадзе (Тбілісі) у скачках у даўжыню. Не хапала толькі чатырох сантыметраў нашаму спартсмену, каб быць пераможцам. Вынік тбіліскага студэнта—6.72. У. Чурыла, які штурхаў ядро ў мужчын ад нашай каманды, заняў трэцяе месца.

Хуткія секунды паказаў у бегу на 800 метраў студэнт А. Пыж (мехмат)—1,55, але гэта —чацвёрты вынік. Адну перамогу аднялі ў гаспадароў спаборніцтва нашы жанчыны, якія былі другімі ў эстафетным бегу 4×100 м—49,5. Але таму, што каманда зборнай Літвы ўдзельнічала па-за конкурсам—47,9, першае месца прысудзілі камандзе БДУ.

Трэба адзначыць спартсменаў Рыгі, Тарту, Адэсы, Алма-Аты, якія таксама вярнуліся са спаборніцтваў з узнагародамі. Слабей за студэнтаў нашай краіны выступілі лёгкаатлеты Кракава і Грэйфсвальда.

**М. КАСЯК.**



**Вялікая ўвага надаецца спорту ў студэнцкіх будаўнічых атрадах.**

**НА ЗДЫМКУ: спаборніцтвы па валейболу на злёце лепшых СБА універсітэта.**

Фота **М. Бабія і М. Маскоўскага.**

# ГІСТОРЫКІ— ПЕРШЫЯ

У фінальным забегу традыцыйнага веснавога універсітэцкага кросу прынялі ўдзел больш за 2 тысячы прадстаўнікоў усіх факультэтаў. Першымі па агульных выніках былі студэнты гістфака. На другім месцы—біёлагі. Хімікі з 9-га месца ў мінулым годзе перамясціліся на 3-е. Апошнімі, як і раней, засталіся прадстаўнікі фізічнага факультэта.

(Наш кар.).

# ПЕРАМАГАЙ СЯБЕ!

**(Працяг. Пачатак у № 17 за 1979 г.).**

Для іншых практыкаванняў аўтагеннай трэніроўкі існуюць вызначаныя позы, найбольш зручныя для расслаблення мышц.

Працамі В. М. Бехцерава і іншых вучоных даказана, што самаўнушэнні лепш рэалізуюцца, калі мышцы максімальна расслаблены. Звычайна гэта бывае ў час засынання і ў перыяд, які непасрэдна наступае за абуджэннем. Таму лепшы час для заняткаў—ранак і вечар. Для расслаблення мышц прымяняецца рад палажэнняў.

Найбольш распаўсюджаныя палажэнні для гэтых заняткаў:

**Палажэнне лежачы.**

Прымаецца зручная, свабодная поза на спіне, галава ляжыць на падушцы, рукі выцягнуты паўз тулава, далонямі ўніз і злёгку сагнуты ў локцях. Ногі выцягнуты, расслаблены, наскі ступняў звернуты наружу.

**Палажэнне седзячы.**

Неабходна сесці на стул і нахіліць тулава трохі ўперад, крыху сагнуць спіну і апусціць галаву на грудзі. Ногі расстаўлены і знаходзяцца пад прамым вуглом адна да другой. Прадплеччы ляжаць на іх без упору, кісці рук свабодна звісаюць, мышцы максімальна расслаблены — поза нагадвае стан «кучара на дрожках», які змарыўся, ці чалавека, які спіць у транспарце (на стуле).

**Палажэнне паўлежачы.**

Седзячы ў крэсле з высокімі падлакотнікамі і падгалоўнікам, зручна адкінуцца на спінку стула, закрыць вочы, ногі па магчымасці выпраміць і некалькі развесці ў бакі. Рукі свабодна палажыць на калені ці падлакотнікі.

**Палажэнне лежачы на баку.**

Дазваляецца ляжаць на любым (правым ці левым) баку. Рука з таго боку, на якой ляжыць той, хто трэніруецца, знаходзіцца далонню пад галавой. Другая рука ляжыць ля тулава ці выцягнута ўперад.

Такім чынам, для аўтагеннай трэніроўкі прымаем найбольш зручнае для нас палажэнне, закрываем вочы, устанаўліваем роўны і спакойны рытм дыхання, вымаўляючы славесную «формулу дыхання»: «Я спакойны... Я зусім спакойны...» (слова «я» вымаўляецца пры ўдыху, слова «спакойны» — пры выдыху. Астатнія фразы формулы вымаўляюцца толькі пры ўдыханні ці ў час паузы паміж удыхам і выдыхам). Пасля 2—3 мінут спакойнага дыхання ў думках вымаўляем славесную формулу супакаення, расслаблення, адключэння ад акружаючага. Паўтараем яе ўдумліва, не спяшаючыся. Неабходна адчуць змест вымаўляемых слоў, ярка ўявіць той стан, які імі абазначаецца. Пасля кожнай фразы наступае невялікая пауза (5—7 секунд), у час якой робім адзін удых і выдых (адзін дыхальны цыкл). Калі ўстановіцца роўнае і раўнамернае дыханне, вымаўляем формулу «адпачынку, спакою і расслаблення».

**Формула «адпачынку, спакою і расслаблення»**

«Я спакойны... Я зусім спакойны...

Я адпачываю... Адпачывае ўсё маё цела...

Цела прыемна расслаблена і адпачывае...

Адпачывае кожная клетачка майго арганізма...

Адпачывае кожны мускул...

Адпачывае кожны нерв...

Мышцы прыемна расслаблены...

Мышцы твару вялыя і спакойныя...

Расслаблены і спакойны мышцы ілба... броваў... вачэй... носа... шчок... губ... рота... (пры гэтым у думках прасачыце за мышцамі твару, і вы заўважыце, як гэтыя мышцы сапраўды пачнуць расслабляецца, а ніжняя чэлюсць злёгку адвісне і язык акажацца ля краю ніжніх зубоў).

Я спакойны... Я зусім спакойны...

Я адпачываю...

Пабочныя гукі перасталі мяне хзаляваць...

Перасталі турбаваць...

Я ўважлівы і сканцэнтраваны на вымаўляемых словах...».

Для асваення гэтага практыкавання патрэбен час (1—2 тыдні)—у залежнасці ад вашых уласных псіхалагічных асаблівасцей. Але пакуль вы свабодна і лёгка не навучыцеся выклікаць стан спакою і адпачынку, пераходзіць да засваення наступнага практыкавання нельга.

Прычым славесныя формулы дазваляецца мяняць па ўгледжанню, прытрымліваючыся агульнага правіла іх вымаўлення. Фразы вымаўляюцца ад першай асобы, адзіночнага ліку, цяперашняга часу, загадным тонам, без часцінкі «не», кожная фраза паўтараецца некалькі разоў, удумліва і не спяшаючыся.

**Г. МАЗО.**

**(Працяг будзе).**

**Рэдактар А. ДЗЕРАШ.**

НАШ АДРАС **220080. Мінск-80, Універсітэцкі гарадок, геаграфічны корпус, п. 14. Тэлефон 22-07-19.**